*Вайна — жорсткая рэч,*
*яна цягне за сабою несправядлівасць і злачынствы.*
*Плутарх*

**Сяргей НОВІКАЎ**

# НАЦЫСЦКАЯ АКУПАЦЫЯ БЕЛАРУСІ: НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ГЕРМАНСКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгенавіч нарадзіўся ў в. Радзіца Крупскага р-на Мінскай вобл. У 1980 г. скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М.Горкага. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Цяпер працуе загадчыкам кафедры гісторыі і беларусазнаўства Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, з'яўляецца аўтарам вучэбна-метадычнага дапаможніка «Курс беларусазнаўства» (Мн., 1998), манаграфіі «Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў» (Мн., 2002).*

Калі ў 1990-я гг. у замежнай гістарыяграфіі з'явіліся новыя працы па гісторыі нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі, айчынныя даследчыкі былі пастаўлены перад складаным выбарам: заставацца ў рамках ранейшых падыходаў і традыцыйных канцэпцый пра Вялікую Айчынную вайну і нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым або выкарыстоўваць у айчыннай гістарыяграфіі новыя метадалагічныя падыходы, якія б адпавядалі найноўшым навуковым тэндэнцыям у вывучэнні гісторыі другой сусветнай вайны, імкнуцца да аб'ектыўнага аналізу гісторыі вайны і гісторыі акупацыі Беларусі.

Сёння большасць даследчыкаў прызнае, што традыцыйныя прыёмы не заўсёды адпавядаюць патрабаванням часу, асабліва калі разглядаць вынікі навуковай працы ў кантэксце міжнароднага асэнсавання праблем гісторыі другой сусветнай вайны. З гэтага пункту гледжання значнай увагі заслугоўвае сучасная германская гістарыяграфія і яе асноўныя навуковыя канцэпцыі.

Германскія гісторыкі Х.Герлах, П.Коль, Б.К'яры, Х.Ленгард, Р.Міхаэліс, Р.-Дз.Мюлер, Г.Рус, Г.Р.Юбершэр і інш. у апошняе дзесяцігоддзе імкнуліся не толькі пашырыць і паглыбіць веды, але і змяніць падыход да вывучэння гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі. На старонках шэрага нямецкамоўных выданняў тэма набыла асаблівую актуальнасць, знайшла новае канцэптуальнае асэнсаванне і навуковую рэпрэзентатыўнасць[1]. Германскія гісторыкі выпрацавалі новыя метадалагічныя падыходы да навуковага пошуку, перагледзелі паняційны апарат. Дзякуючы бесперашкоднаму доступу да архіўных фондаў, актыўнаму выяўленню і апрацоўцы новых дакументальных крыніц яны адмовіліся ад усіх табу на вывучэнне мінулага. На мяжы 1980—1990-х гадоў яны цалкам падтрымалі тэзіс аб акупацыйнай палітыцы нацысцкай Германіі на захопленай тэрыторыі Савецкага Саюза як пра самае "вялікае злачынства з гісторыі нацысцкага панавання над Еўропай"[2]. Германскія даследчыкі пры гэтым засяроджвалі сваю ўвагу не столькі на праблемах тэорыі, стратэгіі і тактыкі бітваў, на перамогах германскага вермахта, гераізме яго афіцэраў і салдат, колькі на вывучэнні нацысцкай практыкі вынішчэння людзей.

Галоўнымі здабыткамі творчай працы германскіх даследчыкаў 1990-х гадоў можна лічыць іх адмову ад традыцыйнай уніфікацыі гісторыі другой сусветнай вайны і выкарыстанне для яе кан-

цэптуальнага асэнсавання розных, перш за ўсё альтэрнатыўных метадалагічных падыходаў. Менавіта ў рамках новых падыходаў замежная гістарыяграфія здолела вынесці на суд прафесійных гісторыкаў і шырокай грамадскасці сваю новую навуковую канцэпцыю ваеннай агрэсіі нацысцкай Германіі на Усходзе, якая разглядалася як частка другой сусветнай вайны, аднак навукова была акрэслена як "вайна Германіі супраць СССР"[3].

У кантэксце гэтага падыходу сучасная германская гістарычная навука вызначае сутнасць вайны на Усходзе: вайна супраць СССР была спланаваным актам агрэсіі. Ад моманту распрацоўкі плана "Барбароса" да загада «Аб камісарах» з захопніцкай янаператварылася ў вайну па вынішчэнні людзей. Захопленыя тэрыторыі СССР разглядаліся ў якасці "новай жыццёвай прасторы", Усход павінен быў стаць харчовай базай Германіі. Вермахт быў непасрэдным выканаўцам палітыкі масавых забойстваў на акупіраванай тэрыторыі. Ахвярай татальнага генацыду з боку Трэцяга рэйха стала яўрэйскае насельніцтва захопленых краін. Жудасны лёс напаткаў савецкіх ваеннапалонных. У Германіі падчас вайны ў самых бесчалавечных формах выкарыстоўвалася прымусовая праца остарбайтэраў. Пры адступленні германскіх армій праводзілася палітыка "выпаленай зямлі"[4].

Асаблівасцю сучаснай германскай гістарыяграфіі з'яўляецца прынцыповы перагляд паняційнага апарату, яго грунтоўнае пераасэнсаванне ў рамках новых навуковых, канцэптуальна распрацаваных высноў. Найбольш яскрава гэта тэндэнцыя адлюстравана на прыкладзе афіцыйнага выкарыстання такога паняцця, як фашызм. Доўгі час у гістарыяграфічнай літаратуры панавалі розныя канцэпцыі, прыхільнікі якіх прытрымліваліся самых супярэчлівых падыходаў пры апісанні яго сутнасці. У сучаснай германскай гістарыяграфіі ўсё больш трывала замацоўваецца пункт гледжання, што натуральнымі з'явамі еўрапейскай гісторыі з 1920-х гадоў і падчас другой сусветнай вайны былі нацызм у Германіі, фашызм у Італіі і бальшавізм у Савецкім Саюзе[5].

Ключавой праблемай, якая ў апошняе дзесяцігоддзе выклікала значны інтарэс германскіх даследчыкаў, была роля вермахта ў другой сусветнай вайне і вайне Германіі супраць СССР. Разгляд гэтага прынцыповага пытання з'явіўся жорсткім выпрабаваннем не толькі для гісторыкаў, але і для ўсяго грамадства ФРГ. На старонкі германскай гістарыяграфіі праблема аб злачынствах вермахта ўпершыню трапіла толькі ўвосень 1991 г. дзякуючы таму, што некаторыя навукоўцы рашуча адышлі ад старых падыходаў і праводзілі даследчыцкі пошук у адпаведнасці з гістарычнай праўдай. Аб'ектыўны адказ на пытанне аб ролі вермахта ў вайне азначаў, па-першае, крах міфа пра "чысты" вермахт, па-другое, прарыў у масавай свядомасці насельніцтва ФРГ і, па-трэцяе, ліквідацыю табу на тэму гісторыі вермахта[6]. Характарыстыка вермахта як аднаго з чатырох "слупоў" нацысцкага рэжыму на акупіраванай тэрыторыі (разам з айнзатцгрупамі Гімлера, рэйхскамісарыятамі Розенберга і эканамічнай арганізацыяй Герынга) не была нечаканасцю для шэрага даследчыкаў, вядучых спецыялістаў розных навуковых установаў, ваенна-гістарычных і архіўных цэнтраў. Яны пастаянна імкнуліся знайсці такія абгрунтаванні, якія б адпавядалі гістарычнай рэчаіснасці і дакументальным крыніцам.

Пераасэнсаванне гісторыі нацысцкай акупацыі прывяло германскіх даследчыкаў да вываду, што "ні адну краіну другая сусветная вайна так моцна не закранула, як Беларусь"[7].

Новыя метадалагічныя падыходы да "вайны Германіі супраць СССР" пакуль яшчэ не з'явіліся гістарыяграфічным фактам у дачыненні да такіх маларасрацаваных аспектаў гэтай праблематыкі, як:

1) аналіз нацысцкай акупацыйнай палітыкі ў святле новых падыходаў і малавядомых раней дакументальных крыніц;

2) вывучэнне дзейнасці ваеннай адміністрацыі, вермахта і яго службаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі;

3) роля "ўсходняга міністэрства" Розенберга на апошнім этапе існавання акупацыйнага рэжыму на занятых усходніх тэрыторыях, у тым ліку ў Беларусі;

4) даследаванне гісторыі партызанскай вайны, яе ваенных і гераічных аспектаў без ідэалагічных штампаў мінулых гадоў;

5) адыход ад легенд, якія стварыла вакол сябе Камуністычная партыя, і выяўленне яе сапраўднай ролі як арганізатара ўсенароднай барацьбы супраць акупантаў;

6) пераасэнсаванне ваеннай гісторыі краін былога СССР з пункту гледжання гісторыі рэальнага ці паўсядзённага жыцця людзей ва ўмовах нацысцкай акупацыі;

7) усебаковае і аб'ектыўнае даследаванне лёсу ваеннапалонных, остарбайтэраў, калабарацыяністаў і інш.

Важнай асаблівасцю, якая вызначае сучасны стан германскай гістарыяграфіі аб нацысцкай акупацыі Беларусі, з'яўляецца не столькі пашырэнне, колькі паглыбленне прадметнага поля навуковых пошукаў. У гістарыяграфічных працах даследчыкаў ФРГ адзначаецца, што аб'ектыўная і інтэнсіўная распрацоўка большасці з гэтых праблем мае вялікае значэнне не толькі для навуковай грамадскасці Германіі, але і іншых краін, асабліва краін былога СССР, у тым ліку і Беларусі[8].

З гэтага вынікае, што сёння беларускім гісторыкам ужо практычна нельга не ўлічваць здабыткаў сучаснай германскай гістарыяграфіі, яе канцэптуальных высноў пра ваенную гісторыю, уведзеных новых дакументальных крыніц па гісторыі вайны і навуковых ацэнак у дачыненні да нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі. Гэта тым

больш важна, што германскія вучоныя займаліся даследаваннем ваеннай праблематыкі сумесна з навукоўцамі розных краін.

Звернемся толькі да некаторых найноўшых прац германскіх гісторыкаў, якія ў сваіх даследаваннях, з аднаго боку, паставілі шэраг прынцыповых пытанняў па ваеннай гісторыі Беларусі, а з другога — паспрабавалі знайсці адказы на іх у адпаведнасці з сучасным узроўнем гістарычных ведаў.

У найноўшай нямецкамоўнай літаратуры па гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі асобнае месца займае праца германскага гісторыка Б.К'яры "Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941—1944" ("Паўсядзённасць па-за фронтам. Акупацыя, калабарацыянізм і супраціўленне ў Беларусі 1941—1944"). Гэта практычна першая навуковая спроба адказаць на нявырашаныя, найбольш значныя пытанні не столькі ваеннай гісторыі, колькі жыцця людзей ці гісторыі паўсядзённасці беларускага грамадства ў перыяд нацысцкай акупацыі нашай краіны. Б.К'яры характарызуе агульнае становішча грамадства на акупіраванай тэрыторыі і прыходзіць да высновы: немцы, якія на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь былі ўцягнуты ў масавы тэрор супраць мясцовага насельніцтва, не здолелі адмовіцца ад радыкальных расавых і ідэалагічных мэт. Адным з самых прынцыповых пытанняў германскі гісторык лічыць становішча беларускай акупіраванай вёскі ў Заходняй Беларусі. Акупацыйная ўлада спрабавала няшчадна выкарыстоўваць гаспадарку вясковых жыхароў, разглядаючы яе як аб'ект германскай эканамічнай палітыкі не толькі для патрэб вермахта, грамадзянскай адміністрацыі, але і для Трэцяга рэйха. Германскі даследчык адзначае, што часцей за ўсё сітуацыя ў вёсцы фарміравалася пад уплывам барацьбы за ўладу і кантроль не толькі з боку акупацыйнай адміністрацыі, але і розных узброеных груп і нават асобных людзей. Гэта стварала вялікую напружанасць вакол беларускіх вёсак, дзе панавала атмасфера агульнага страху, назіралася эскалацыя насілля, а насельніцтва цалкам было пазбаўлена спакою.

Пры высвятленні характару германскай акупацыі, які Б.К'яры імкнецца выявіць на аснове разгляду падзей у маштабе заходняга рэгіёна Беларусі, аўтар падрабязна апісвае асабістае жыццё людзей: як яны перажылі вайну, якімі асабістымі мэтамі кіраваліся, як здолелі захаваць чалавечы твар ва ўмовах акупацыі. Германскі даследчык прыходзіць да высновы, што паўсядзённае жыццё беларусаў у гады нацысцкай акупацыі — гэта барацьба за выжыванне, цяжкі экзамен на трываласць, непазбежнае выпрабаванне ваеннай катастрофай[9].

Значны інтарэс на старонках замежных выданняў знайшлі пытанні аб эканамічных аспектах нацысцкай акупацыі Беларусі. Як адзначана ў гістарыяграфічнай працы Р.-Дз.Мюлера і Г.Р.Юбершэра "Hitlers Krieg im Osten 1941—1945" ("Вайна Гітлера на Усходзе 1941—1945"), план "Барбароса" ў значнай ступені вызначаў эканамічны характар вайны. Гэта выснова знайшла грунтоўнае пацвярджэнне ў шматтомнай гісторыі "Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg", ("Германскі рэйх і другая сусветная вайна"), дакументальнай працы "Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten" ("Германская эканамічная палітыка на акупіраваных савецкіх тэрыторыях") і ў шэрагу асобных публікацый германскіх даследчыкаў.

Германскай эканамічнай палітыцы ў Беларусі ў гады нацысцкай акупацыі прысвечана даследаванне берлінскага гісторыка Х.Герлаха "Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944" ("Скалькуляваныя забойствы: германская эканамічная палітыка і палітыка вынішчэння ў Беларусі 1941—1944"), якое ў 2000 г. нямецкім часопісам "Damals" было названа лепшым сярод фундаментальных даследаванняў у галіне гістарычнай навукі ФРГ. Х.Герлах характарызуе планы па эканамічнаму рабаванню Беларусі як праграму знішчэння беларускага насельніцтва шляхам "галоднай смерці", а таксама паказвае канкрэтныя дзеянні па вынішчэнні яўрэяў, ваеннапалонных, жыхароў беларускіх гарадоў і вёсак. Аўтар крытычна асэнсоўвае сутнасць дзейнасці ваеннай і грамадзянскай адміністрацый на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, дзе з лета 1941 па лета 1944 г. выконваліся злачынныя дырэктывы вышэйшага кіраўніцтва нацысцкай Германіі[10].

Разглядаючы германскую эканамічную палітыку ў Беларусі на аснове аналізу дакументальных і гістарыяграфічных крыніц, Х.Герлах паказвае асаблівасці выканання "гаспадарчых заданняў на 1941/42, 1942/43 і 1943/44 гг.". Такія захады акупацыйнага рэжыму па эксплуатацыі вытворчага патэнцыялу і насельніцтва Беларусі Х.Герлах тлумачыць тым фактам, што з восені 1941 г. вышэйшае нацысцкае кіраўніцтва пачало праводзіць тактыку татальнага выкарыстання акупіраванай тэрыторыі Беларусі як аднаго з гаспадарчых аб'ектаў каланіяльнай эканомікі на Усходзе[11]. Аднак эканамічныя аспекты дзейнасці службаў вермахта, войскаў СС, паліцыі, а таксама спецыяльных гаспадарчых каманд, галоўных аддзелаў генеральных камісарыятаў і аддзелаў акруговых камісарыятаў берлінскі гісторык разглядае ў кантэксце трохгадовага існавання ўсёй сістэмы акупацыйнага рэжыму і прыходзіць да высновы аб катастрафічных выніках эксплуатацыі, рабавання і вынішчэння гаспадарчага і чалавечага патэнцыялу Беларусі. Даследаванне злачыннага характару нацысцкай палітыкі вынішчэння і вызначэнне яе маштабаў на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі Х.Герлах праводзіць у дачыненні да яўрэяў, ваеннапалонных і мірных жыхароў.

Замацаванне такога падыходу ў сучаснай германскай гістарыяграфіі адбываецца і ў іншых працах, сярод якіх асабліва важнымі для беларускай гістарычнай навукі з'яўляюцца, на наш погляд, даследаванні П.Коля*

Крытычнаму даследаванню нацысцкай акупацыі Беларусі, асэнсаванню новых метадалагічных падыходаў у германскай гістарыяграфіі садзейнічаюць супрацоўніцтва гісторыкаў Беларусі і Германіі, іх навуковыя дыскусіі па актуальных пытаннях ваеннай гісторыі і гісторыі акупацыі Беларусі, шырокае і адкрытае абмеркаванне спрэчных ці “вузкіх” пытанняў, сумеснае правядзенне “круглых сталоў”, навуковых семінараў і канферэнцый.

Дзякуючы навуковым кантактам, якія ў апошні час усталяваліся паміж акадэмічнымі і вучэбнымі ўстановамі, грамадскімі цэнтрамі, а таксама паміж некаторымі навукоўцамі, толькі за апошнія гады было праведзена некалькі міжнародных канферэнцый з удзелам вядучых германскіх гісторыкаў. Падчас гэтых сустрэч праходзілі прэзентацыі кніг Х.Герлаха, Б.К'яры, П.Коля. Замежныя аўтары знаёмілі беларускую гістарычную грамадскасць з вынікамі сваіх даследчыцкіх пошукаў, адказвалі на пытанні, дыскутавалі з беларускімі калегамі. Як не раз адзначалася на праведзеных форумах, усталяванне менавіта сталых кантактаў як паміж беларускімі і германскімі гісторыкамі, так і паміж навуковымі і вучэбнымі ўстановамі можа з'явіцца надзейнай асновай для новага асэнсавання гісторыі германскай акупацыі Беларусі ў 1941—1944 гг.

---

*Рэцэнзія С.Я.Новікава “Лагер смерці Трасцянец” на працу П. Коля «Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente” (Dortmund, 2003) надрукавана ў часопісе № 8 за 2003 г.

---

[1] Heer H., Naumann K. Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944. Hamburg, 1995; *Gerlach Ch.* Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000; Deutsche Wirtschaftsinteressen und Besatzungspolitik in Weissrussland, 1941—1943 // Трагічнае лета 1941: напамін гісторыі: Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 22 чэрвеня 2001. Мн., 2001. С. 41—49; *Lenhard H.* “Lebensraum im Osten”: Deutsche in Belorussland 1941—1944. Duesseldorf, 1991; *Kohl P.* Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei 1941—1944. Frankfurt a.M., 1994; “Schoene Gruesse aus Minsk”. Muenchen, 2001; Das Vernichtunglager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente. Dortmund, 2003; *Chiari B.* Die Kriegsgesellschaft. Weissrussland im Zweiten Weltkrieg (1939—1944) // Handbuch der Geschichte Weissrusslands. Herausgegeben von Diertich Beyrau und Rainer Lindner. Goettingen, 2001. S. 11—22; Geschichte als Gewalttat. Weissrussland als Kind Zweier Weltkriege // Трагічнае лета 1941: напамін гісторыі: Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 22 чэрвеня 2001. С. 128—144; Лёс беларускіх габрэяў у “Генеральным камісарыяце Беларутэніі” // Беларускі гістарычны агляд. Т. 7. Сш. 1 (12). Мн., 2000. С. 29—67; *Mueller R.-D.* Das “Uenternehmen Barbarossa” als wirtschaftlicher Raubkrieg // Der deutsche Ueberfaell auf die Sowjetunion. S. 125—157; *Mueller R.-D., Ueberschaer G.R.* Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. Darmstadt, 2000; *Рус Г.* СД у Баранавічах (1941—1943) // Беларускі гістарычны агляд. Т. 5. Сш. 1 (8). Мн., 1998. С. 67—87; *Ueberschar G.R.* Hitlers Entschluss zum “Lebensraum”-Krieg im Osten. Programmatisches Ziel oder militaerstrategisches Kalkul? // Der deutsche Ueberfall auf die Sowjetunion. S. 13—43; *Michaelis R.* Das SS-Sonderkommando Dirlewanger: ein Beispiel deutscher Besatzungspolitik in Weissrussland. Berlin, 1998.

[2] Mueller R.-D., Ueberschaer G.R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. S. 310.

[3] Там жа. С. 52; Lenhard H. “Lebensraum im Osten”: Deutsche in Belorussland 1941—1944. S. 11.

[4] Lenhard H. “Lebensraum im Osten”: Deutsche in Belorussland 1941—1944. S. 11–23.

[5] Mueller R.-D., Ueberschaer G.R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. S. 225–271.

[6] Eine Ausstellung und ihre Folgen: Zur Rezeption der Ausstellung “Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944”. Hamburg, 1999. S. 9.

[7] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. S. 11.

[8] Mueller R.-D., Ueberschaer G.R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. S. 323.

[9] Chiari B. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941—1944. S. 153—159.

[10] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. C. 46, 503—1104.

[11] Там жа. С. 258.